— вывучэнне моцных бакоў асобы маладога выкладчыка-музыканта з мэтай стымулявання патрэбы ў самаўдасканаленні;

— фарміраванне каштоўнасных адносін да асобы вучня, у дачыненні да якой метадычныя веды і выканальніцкае майстэрства з'яўляюцца сродкам яе ўсебаковага развіцця.

**А.І.Смолік,**
**прафесар Беларускага універсітэта культуры**

## СУЧАСНАЕ АСЭНСАВАННЕ МЭТ, ЗАДАЧ І ЗМЕСТУ ВЫТВОРЧАЙ ПРАКТЫКІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўнае будаўніцтва, якое распачалося на мяжы стагоддзяў, немагчымае без карэннай рэарганізацыі сістэмы падрыхтоўкі, перападрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў народнай гаспадаркі, адукацыі і культуры. Іх кваліфікацыя, кампетэнтнасць і высокая грамадзянская адказнасць у многім забяспечваюць вырашэнне задач, якія стаяць перад грамадствам.

Спецыфічнай формай навучальнага працэсу з'яўляецца вытворчая практыка, якая забяспечвае студэнтам магчымасць атрымання прафесійных ведаў, навыкаў і ўменняў непасрэдна ў мастацка-творчым або педагагічным калектывах, ва ўстановах культуры і мастацтва. Дасягненне мэты навучання немагчымае без пэўнай практычнай падрыхтоўкі будучых менеджэра, бібліятэкара, сацыяльнага педагога, рэжысёра, хормайстра. Таму галоўная мэта вытворчай практыкі — замацаванне тэарэтычных ведаў студэнтаў у працэсе засваення імі сацыякультурнай і мастацка-творчай дзейнасці. Між тым, як сведчыць вопыт, на практыцы нярэдка мэты падмяняюцца задачамі і зводзяцца да фарміравання ў студэнта цікавасці да прафесіі, набыцця ім якасцей, неабходных работніку сацыяльна-культурнай сферы, выпрацоўкі прафесійных уменняў і навыкаў і інш.

У дакументах, распрацаваных кафедрамі, толькі ў самым агульным плане раскрываюцца пытанні зместу практыкі. У якасці асноўнай мэты, думаецца, неправамерна вызначаецца неабходнасць фарміравання ў практыкантаў прафесійнага майстэрства. На наш погляд, асноўнай мэтай практыкі з'яўляецца выпрацоўка прафесійнага ўмельства, якое ўяўляе першапачатковую ступень прафесіяналізму арганізатара сацыякультурнай дзейнасці. Вытворчая практыка павінна дапамагчы авалодаць асновамі прафесійнага ўмельства, падрыхтавацца да самастойнай культурна-творчай дзейнасці. Вылучаць жа ў якасці мэты практыкі фарміраванне ў студэнтаў прафесійнага майстэрства немэтазгодна. Яны могуць пазнаёміцца з майстэрствам у мастацка-творчых калектывах, многія з якіх ужо самі на даволі высокім узроўні валодаюць выканальніцкімі навыкамі і ўменнямі. Тым больш што харэографы, музыканты, хормайстры, дырыжоры, рэжысёры, балетмайстры і іншыя будуць выпрацоўваць выканальніцкае і педагагічнае майстэрства пазней, самастойна працуючы ў мастацка-творчых калектывах.

Такім чынам, праца адміністрацыі, супрацоўнікаў устаноў культуры і мастацтва, а таксама практыкантаў павінна будавацца з улікам фарміравання ў іх прафесійнага ўмельства.

У вучэбных планах Беларускага універсітэта культуры ўсе віды і формы практычнага засваення фундаментальных агульнапрафесійных і спецыяльных ведаў займаюць 15% вучэбнага часу. Практыка, з'яўляючыся спецыфічнай формай навучання, мае прафесійную накіраванасць і арганічна ўзаемазвязана з профілем факультэта і выпускаючай кафедрай. Асобныя віды практыкі пачынаюцца на першым курсе. Наведванне ўстаноў культуры і мастацтва садзейнічае ўвядзенню першакурснікаў у іх будучую спецыяльнасць, паказвае спецыфіку культурна-творчай дзейнасці. На старэйшых курсах студэнты ўжо знаёмяцца са структурай, формамі, метадамі, тэхналогіямі і сродкамі дзейнасці сацыяльна-культурных устаноў, далучаюцца да некаторых відаў мастацка-творчай работы. На выпускных курсах адбываюцца сістэматызацыя тэа-

рэтычных ведаў па агульнапрафесійных і спецыяльных дысцыплінах, паглыбленне і замацаванне ўменняў і навыкаў, атрыманых у працэсе навучання. Нярэдка студэнты маюць магчымасць самастойна працаваць над увасабленнем сваіх творчых задум, якія становяцца потым асновай дыпломных праектаў.

Вытворчая практыка з'яўляецца своеасаблівай працоўнай школай будучага культарганізатара. У сувязі з гэтым вялікае значэнне мае выбар баз практыкі. Пажадана, каб імі былі ўстановы, арганізацыі і прадпрыемствы сацыякультурнай сферы, дзе назапашаны разнастайныя сучасныя тэхналогіі культурна-творчай дзейнасці. Кафедры і дэканаты універсітэта выкарыстоўваюць у якасці баз практыкі звыш 300 культурна-асветных устаноў, мастацка-творчых калектываў, бібліятэк, аддзелаў і ўпраўленняў культуры выканаўчых камітэтаў, сродкаў масавай інфармацыі і інш. Так, студэнты факультэта мастацкай творчасці праходзяць вытворчую практыку ў 72-х творчых калектывах. Сярод іх Дзяржаўны аркестр народных інструментаў імя І.Жыновіча, Дзяржаўны ансамбль танца, Дзяржаўны народны хор імя Г.Цітовіча, харэаграфічны ансамбль "Харошкі", Дзяржаўны тэатр музычнай камедыі і інш. Асноўныя базы практыкі студэнтаў факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм — гэта вядучыя бібліятэкі: Нацыянальная бібліятэка Беларусі, буйнейшыя галіновыя бібліятэкі, Гомельская абласная бібліятэка, Заслаўскі музей-запаведнік і інш. Гэтымі і іншымі сацыякультурнымі ўстановамі ў практычнай дзейнасці выкарыстоўваюцца новыя прынцыпы, метады, формы і сродкі, з дапамогай якіх фарміруецца і інтэнсіўна асвойваецца сфера адпачынку і вольнага часу. Сучасная культурная дзейнасць уяўляе дынамічны працэс, развіццё якога пастаянна патрабуе творчага падыходу да вырашэння праблем. Дзейнасць у сацыяльна-культурнай сферы, акрамя таго, з'яўляецца яшчэ і многафункцыянальнай, сацыяльна значнай, творчым накірункам чалавечай практыкі.

Поспех практыкі залежыць не толькі ад правільнага вызначэння яе мэт і задач, але і ад уяўлення студэнтамі і іх кіраў-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

нікамі зместу практычнай дзейнасці. Вядома, што змест вытворчай практыкі не павінен зводзіцца толькі да фарміравання пэўных уменняў і навыкаў, якія выпрацоўваюцца ў працэсе адпаведнай дзейнасці практыкантаў. Па нашым меркаванні, змест практыкі мае двухпланавы характар: з аднаго боку, ён уключае сістэму прафесійных уменняў і навыкаў, а з другога — розныя віды і формы сацыяльна-культурнай дзейнасці, у працэсе якой гэтыя ўменні і навыкі фарміруюцца. Якасная арганізацыя вытворчай практыкі заключаецца ў тым, каб стымуляваць студэнтаў да выкарыстання разнастайных відаў і формаў культурна-асветнай дзейнасці і да выпрацоўкі ў працэсе яе пэўных уменняў і навыкаў.

Падчас практыкі студэнты павінны засвоіць асаблівасці, сувязі і адносіны, своеасаблівыя формы і метады работы сучасных сацыякультурных інстытутаў. Істотныя змены, якія адбываюцца ў методыцы культурна-творчай і мастацка-творчай дзейнасці, вымагаюць азнаямлення з імі яшчэ ў перыяд навучання. Спецыяліст не адбудзецца, калі не зразумее тых глыбінных змен у культуралагічных працэсах, не асэнсуе функцый, задач, мэт, метадаў і сродкаў дзейнасці прадпрыемстваў, арганізацый і ўстаноў культуры і мастацтва. У перыяд практыкі будучыя спецыялісты павінны азнаёміцца з вопытам асветніцкай, выхаваўчай, культурна-творчай работы, назапашанай сацыякультурнымі інстытутамі.

Аналіз арганізацыі практыкі на пастаянна дзеючых базах сведчыць: іх супрацоўнікамі назапашаны багаты вопыт работы са студэнтамі. Да студэнтаў кіраўнікі і супрацоўнікі ўстаноў культуры і мастацтва адносяцца як да будучых калег, ствараюць умовы выканання праграмы практыкі. Нярэдка студэнты маюць магчымасць выконваць сур'ёзную мастацка-творчую і культурна-асветніцкую работу, займацца навуковымі даследаваннямі. Так, студэнты факультэта бібліятэчна-інфармацыйных сістэм праводзяць агляды літаратуры, распрацоўваюць і афармляюць кніжныя выставы, робяць пераклады з замежных моў, удасканальваюць алгарытмы карыстання паказальнікамі літаратуры. Выпускнікі факультэ-

таў культуралогіі і мастацкай творчасці падчас практыкі арганізоўваюць навукова-творчыя фальклорныя экспедыцыі з мэтай вывучэння дзейнасці народных майстроў, набыцця іх твораў. Яны ладзяць масавыя святы, пленэры, запісваюць легенды, паданні, беларускія народныя песні, выступаюць з канцэртамі мастацкай сама-дзейнасці, увасабляюць свае інструментоўкі і аранжыроўкі музычных твораў у працы з творчымі калектывамі. Безумоўна, змест практыкі вызначаецца стандартамі, вучэбнымі планамі, праграмамі падрыхтоўкі спецыялістаў. Тым не менш вопыт арганізацыі практыкі сведчыць, што маецца патрэба ў распрацоўцы праграм па ўсіх відах практыкі. У Беларускім універсітэце культуры існуюць рознаўзроўневыя праграмы. На факультэце мастацкай творчасці дзейнічае скразная праграма вытворчай і педагагічнай практыкі, якая дазваляе ажыццяўляць пераемнасць і паступовасць набыцця будучымі спецыялістамі практычных уменняў і навыкаў. На факультэце бібліятэчна-інфармацыйных сістэм праграмы практыкі створаны для кожнага курса ў адпаведнасці са спецыялізацыяй студэнтаў. Староўчым з'яўляецца тое, што праграмы ўзгадняюцца з кіраўніцтвам баз практык. Гэта дазваляе ўлічваць змены, якія адбываюцца ў сацыякультурнай сферы, асаблівасці функцыяніравання таго або іншага сацыяльна-культурнага інстытута. Праграмы штогод пераглядаюцца і дапаўняюцца заданнямі, звязанымі з выкарыстаннем новых інфармацыйных тэхналогій, інавацыйных формаў работы, сучасных прынцыпаў культурнай дзейнасці.

Аналіз створаных праграм дазваляе сцвярджаць, што перавага аддаецца комплексным праграмам бесперапыннай прафесійнай падрыхтоўкі студэнтаў на ўвесь тэрмін іх навучання. Яна аб'ядноўвае ўсе віды практыкі, уключае змест, тэхналогію, парадак праходжання практыкі, адлюстроўвае цэласную сістэму, спецыфіку практычнай падрыхтоўкі высокакваліфікаваных кадраў на розных ступенях навучання, пераемнасць паміж формамі, відамі практык, а таксама паступова ўключае студэнта ў сацыяльна-культурную і мастацка-творчую дзейнасць.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

На наш погляд, кафедрам факультэта культуралогіі неабходна перайсці на новы ўзровень арганізацыі вытворчай практыкі. Практычныя заданні на час практыкі, якія акрэс-ліваюць яе змест, не заўсёды дазваляюць улічваць тэндэнцыі сацыякультурнай сферы, сутнасць культурна-творчай дзейнасці. Наспеў час абагульніць вопыт, назапашаны кафедрамі іншых факультэтаў, і стварыць комплексныя скразныя праграмы практыкі на пяцігадовы тэрмін навучання.

Думаецца, заслугоўвае ўвагі дзейнасць кафедры бібліяграфіі і дакументазнаўства па мадэліраванні бібліятэчнай практыкі. Навукоўцы пад кіраўніцтвам прафесара Л.А.Дзямешкі стварылі мадэль дзеяння і ўзаемадзеяння студэнтаў, выкладчыкаў, бібліятэчных работнікаў баз практыкі, накіраваных на фарміраванне высокіх прафесійных якасцей будучага бібліятэкара. Метадалагічнай асновай мадэлі з'яўляецца канцэпцыя падрыхтоўкі спецыяліста як суб'екта бібліятэчнага асяроддзя. Мадэліраванне прадугледжвае першапачатковае асэнсаванне студэнтам сваёй суб'ектнасці ў сацыякультурным асяроддзі, самавызначэнне найбольш прыярытэтных накірункаў культурна-творчай дзейнасці ў адпаведнасці з асобаснымі ўстаноўкамі, здольнасцямі, схільнасцямі, творчымі захапленнямі; мадэліраванне прафесійнай дзейнасці ў адпаведнасці са спецыялізацыяй. Мадэль практыкі прадугледжвае строгую сістэматызацыю віду, тэрмінаў, мэт, задач і зместу, практычных заданняў, арганізацыйных формаў. Мадэль, як паказвае вопыт, сістэматызуе змест практыкі, садзейнічае яе ўдасканаленню ў кантэксце сучасных патрабаванняў да спецыяліста сацыякультурнай сферы.

На наш погляд, наспеў час стварэння канцэптуальнай асновы тэарэтычных і метадычных ідэй па карэнным удасканаленні мэты, зместу і арганізацыі вытворчай практыкі студэнтаў ВНУ культуры і мастацтва. Зыходнымі палажэннямі мадэлі арганізацыі вытворчай практыкі з'яўляюцца наступныя:

— глыбокае навукова-практычнае асэнсаванне кафедрамі,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

студэнтамі, супрацоўнікамі ўстаноў культуры мэт і задач вытворчай практыкі;

— арыентаванасць студэнтаў на выпрацоўку ў сабе прафесійна-асобасных уласцівасцей і якасцей, замацаванне іх;

— мэтазгоднасць у якасці баз практыкі вызначаць установы культуры і мастацтва, творчыя калектывы, у якіх выкарыстоўваюцца разнастайныя формы іх дзейнасці, ідзе пастаянны пошук інавацыйных тэхналогій сацыяльна-культурнай дзейнасці;

— асноўныя функцыі па арганізацыі і кіраўніцтве практыкай павінны выконваць супрацоўнікі ўстаноў культуры і мастацтва, мастацкія кіраўнікі творчых калектываў. Менавіта яны добра ведаюць сацыяльна-педагагічныя ўмовы функцыяніравання тэхналогіі культурна-адпачынкавай дзейнасці, гаспадарчы механізм устаноў культуры, таму могуць дэманстраваць узоры сацыякультурнай дзейнасці і вучыць практыкантаў на ўласным вопыце, чаго не ў стане зрабіць часам выкладчык ВНУ;

— у кожную культурна-асветную ўстанову, дзе практыкуюцца студэнты, універсітэт накіроўвае найбольш кваліфікаваных педагогаў-кансультантаў, якія ажыццяўляюць навукова-метадычную дапамогу супрацоўнікам устаноў культуры і мастацтва і студэнтам, праводзяць інструктаж, вывучаюць якасць іх работы і станоўчы вопыт, наведваюць і аналізуюць заліковыя мерапрыемствы, удзельнічаюць у абароне практыкі.

Нам падаецца, што распрацоўка новай канцэптуальнай мадэлі арганізацыі вытворчай і педагагічнай практыкі павінна ажыццяўляцца навуковым калектывам, які будзе складацца з навукова-педагагічных работнікаў усіх ВНУ культуры і мастацтва. Найбольш вопытныя педагогі Беларускага універсітэта культуры, Беларускай акадэміі музыкі, Беларускай акадэміі мастацтваў здольныя выявіць слабыя месцы ў правядзенні вытворчай практыкі, знайсці эфектыўныя шляхі яе ўдасканалення.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ